

Не павінна быць закінутых будынкаў

СТАР. 5



Што рабіць з няякасным абуткам?

СТАР. 5



Оперная дзіва — пра час і пра сябе

СТАР. 7

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ЛІСТАПАДА 2016 г. СЕРАДА № 216 (28326)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Дасягненні навукі мусяць быць карыснымі

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ прапанаваў больш шырока выкарыстоўваць дасягненні навукі для аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву. Адпаведную заяву спікер верхняй палаты зрабіў падчас наведвання рэспубліканскага навукова-медыцынскага цэнтра «Клетачныя тэхналогіі» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, паведамляе БЕЛТА. Акрамя таго, у мерапрыемстве ўзялі ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА, старшыня Прэзідыума НАН Уладзімір ГУСАКОЎ, міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО, прадстаўнікі медыцынскіх устаноў краіны.**

«Неабходна шырэй выкарыстоўваць дасягненні навукі для медыцынскай дапамогі насельніцтву, больш актыўна прапагандаваць магчымасці айчынных перадавых тэхналогій», — заклікаў Міхаіл Мясніковіч. У сваю чаргу, **дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Людміла ДУБОЎСКАЯ** і яго навуковыя супрацоўнікі азнаёмілі гасцей з вытворчасцю біямедыцынскіх клетачных прадуктаў і банкам стваловых клетак, паказалі лячэбную паліклінічную базу. Абмяркоўваліся пытанні пашырэння магчымасцяў цэнтра, а таксама праблемы, якія неабходна вырашаць для паспяховага функцыянавання арганізацыі.

Навукова-медыцынскі цэнтр «Клетачныя тэхналогіі» адкрыты ў Інстытуце біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН 5 снежня 2014 года. Праект рэалізаваны згодна з дзяржаўнай праграмай «Інавацыйныя біятэхналогіі» на 2010—2012 гады і на перыяд да 2015 года. Цэнтр уключае лячэбную паліклінічную базу, аперацыйны блок, кабінет УГД, палаты дзённага знаходжання.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

## КАНТАКТЫ — НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ запрасіў прэм'ера Дзяржаўнага савета Кітая Лі КЭЦЯНА наведаць з візітам Беларусь. Адпаведная прапанова была агучана падчас сустрэчы кіраўніка беларускага ўрада з прэм'ерам Дзяржсавета Кітая ў Рызе.**

У мінулую суботу там праходзіў саміт кіраўнікоў урадаў краін — удзельніц фармату «16+1». Гэта ініцыятыва Кітайскай Народнай Рэспублікі, сутнасць праекта — у актывізацыі супрацоўніцтва з 11 краінамі — удзельніцамі ЕС і 5 балканскімі краінамі (Албанія, Балгарыя, Боснія і Герцагавіна, Венгрыя, Латвія, Літва, Македонія, Польшча, Румынія, Сербія, Славакія, Славенія, Харватыя, Чарнагорыя, Чэхія, Эстонія) у галіне інвестыцый, транспарту, фінансаў, навукі, адукацыі і культуры. На саміт у Рызе быў запрошаны і кіраўнік нашага ўрада.

Андрэй Кабякоў нагадаў, што па выніках дзяржаўнага візіту ў Кітай Аляксандра Лукашэнкі ў верасні 2016 года ўстаноўлены новы ўзровень адносін давернага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж краінамі. «Знаходзячыся ў Пекіне, кіраўнік беларускай дзяржавы выступіў з ініцыятывай стварэння фармату штогадовых асабістых сустрэч на ўзроўні кіраўнікоў урадаў дзвюх краін. Пачаць можам з вашага візіту ў Беларусь. Я пацвярджаю накіраванае вам запрашэнне наведаць нашу краіну», — сказаў прэм'ер-міністр. Ён таксама падзякаваў за запрашэнне ўдзельнічаць у гэтым саміце кіраўнікоў урадаў. «Дазвольце выказаць падзяку кітайскаму боку і асабіста вам, спадар Лі Кэцян, за падтрымку ўдзелу Беларусі ў новым для нас фармаце «16 + 1», — адзначыў Андрэй Кабякоў. У сваю чаргу Лі Кэцян падзякаваў за запрашэнне наведаць Беларусь і заявіў, што са свайго боку зробіць усё неабходнае для ўмацавання двухбаковых адносін паміж краінамі.

«Важна, каб нашы ведамствы пастаянна падтрымлівалі сувязі. І я асабіста гатовы садзейнічаць вырашэнню шэрагу пытанняў, паднятых беларускім бокам. Неабходна таксама, каб мы з вамі разам вызначылі вектары нашага супрацоўніцтва», — заявіў Лі Кэцян.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## Дазваніцца да віцэ-спікера

### Упершыню ў верхняй палаце парламента адбылася «прамая лінія»

**У мінулую суботу намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Марыяна ШЧОТКІНА правяла «прамую тэлефонную лінію» на тэму «Правапрымяняльная практыка законаў Рэспублікі Беларусь у сацыяльна-працоўнай сферы».**

Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, гэта першае мерапрыемства такога фармату ў верхняй палаце беларускага парламента.

СТАР. 2

# ТАТАВА ЧЫТАНКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Настаўнік стаўбцоўскай школы мастацтваў Уладзімір КУДЗІН сам некалі быў актыўным чытачом дзіцячай бібліятэкі. Цяпер ён прывёў сюды сваю шасцігадовую дачку Вікторыю.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір КАЛТОВІЧ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«У краіне актыўна дыверсіфікуецца экспарт. У прыярытэце сёння Расія, мы больш за ўсё пастаўляем прадукцыі на гэты рынак, але ёсць даручэнне ўрада аб дыверсіфікацыі экспарту. Калі казаць пра ўнутраны рынак, то сёння ўзровень айчынных тавараў складае больш за 80%. Нагадаю, што ў адпаведнасці з канцэпцыяй харчовай бяспекі ўзровень імпарту не павінен перавышаць 25%. Так што Беларусь можа з гонарам заяўляць, што харчовая бяспека ў краіне забяспечана».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9062 | ▲ |
| Еўра | 2,1064 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0299 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0745 | ■ |

■ На свае вочы

## ЛЁГКІХ ДЗЯЖУРСТВАЎ ТУТ НЕ БЫВАЕ

### Адзін дзень з брыгадай хуткай дапамогі

**Белыя машыны з чырвонымі надпісамі ездзяць па горадзе і днём, і ноччу, а што адбываецца ўнутры, мы можам толькі здагадвацца. Шчаслівыя тыя, каму не даводзілася туды трапляць. Карэспандэнты «Звязды» правялі разам з супрацоўнікамі хуткай медыцынскай дапамогі больш за дванаццаць гадзін і даведаліся пра асаблівасці іх работы.**

ДЗЯСЯТАЯ падстанцыя хуткай медыцынскай дапамогі Мінска адкрылася ўсяго два гады таму. **Фельдшар Святлана ЦІТОВА**, перш чым заступіць на дзяжурства і пачаць непасрэдна знаёміць нас са сваёй працай, праводзіць экскурсію па будынку.

— Тут сталовая, там душавыя, а гэта мой пакой для адпачынку, — жанчына запрашае ўнутр: чатыры ложкі (для кожнага супрацоўніка свой), два крэслы, тэлевізар. — Утульна. Хаця мы, канешне, надоўга тут ніколі не затрымліваемся.

«Наша работа без права на сон, але з правам на адпачынак», — адзначае **загадчыца падстанцыі Ірына РУДАЯ**. Нават калі нехта задрамаў, «праваронiць» выклік не атрымаецца, паколькі па ўсёй падстанцыі і нават на вуліцы ўсталяваны селектары (нешта накшталт радыё). Праз іх дыспетчар перадае нумар брыгады і прозвішчы супрацоўнікаў, якія выязджаюць на выклік. За



Фота Надзеі БУЖАН.

**Фельдшару трэба ўмець прымаць хуткія рашэнні.**

лічаныя секунды, дзе б ты ні быў, павінен з'явіцца на першым паверсе, каб высветліць падрабязнасці, забраць неабходныя рэчы і адправіцца ў дарогу.

СТАР. 3

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «Адчуваецца сувязь рэдакцыі з людзьмі»

**Іван МУРАВЕЙКА, пісьменнік, ветэран Вялікай Айчыннай вайны:**

— Першае, што вылучае «Звязду» сярод іншых газет, — тое, што яна на чыста беларускай мове. Матэрыялы на роднай мове — сёння не тое што рэдкасць, а ў пэўным сэнсе нават эксклюзіў! Я парэкамендаваў бы моладзі вывучаць беларускую мову ў тым ліку па газетных артыкулах.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«Звязда» заўсёды была для мяне самай лепшай газетай. І не толькі з-за сваёй беларускай каларытнасці. Калі гартаеш газетныя старонкі, адчуваецца сувязь рэдакцыі з людзьмі. Некалі, як я працаваў у раёнцы, ледзь не палову нумара складалі матэрыялы пазаштатных аўтараў. Цяперашнія газеты, і рэспубліканскія, і раённыя, наогул, пабудаваны на публікацыях сваіх карэспандэнтаў. «Звязда» ў гэтым плане наперадзе: простыя людзі расказваюць пра асабістыя або суседскія прыгоды, сваім жыццёвым досведам дзеляцца знакавыя асобы...

За рубрыкамі асабліва не сачу. Многія матэрыялы прыцягваюць маю ўвагу. Асабліва цікавая ваша старонка аб культуры. Толькі парэкамендаваў бы аўтарам звярнуць увагу ў тым ліку на народную творчасць.

Былі часы, калі кожная газета рэгулярна публікавала звароты ў рэдакцыю, літаратурныя і гумарыстычныя старонкі. Мы кажам сёння пра крытыку, а дзе яна? З газетных старонак знік нарыс. «Звязда», мне здаецца, у гэтым плане выйграе.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Выбары прэзідэнта праходзяць у ЗША



Амерыканскія грамадзяне выбіраюць новага прэзідэнта і віцэ-прэзідэнта і пераабяруць увесь склад Палаты прадстаўнікоў і трацiну Сената Кангрэса ЗША, губернатараў 12 штатаў і мэраў некалькіх гарадоў. На пасаду кіраўніка дзяржавы прэтэндуюць кандыдат ад Дэмакратычнай партыі экс-дзяржсакратар Хілары Клінтан і кандыдат ад Рэспубліканскай партыі бізнесмен Дональд Трамп. Апытанні паказваюць, што амерыканцы крыху больш сімпатызуюць Клінтан. У выпадку яе перамогі гэта будзе першая ў гісторыі ЗША прэзідэнт-жанчына. Апошнім на кантынентальнай частцы ЗША ў 20.00 па мясцовым часе (9 гадзін раніцы 9 лістапада) зачыніцца выбарчы ўчастак на Алясцы. Упершыню ў гісторыі ЗША колькасць зарэгістраваных выбаршчыкаў перавысіла 200 млн. У цяперашнюю прэзідэнцкую кампанію рэкордная колькасць амерыканцаў прагаласавала датэрмінова — каля 44,9 мільёна чалавек.

### Турцыя пабудуе тры АЭС

Турцыя матываваная рэалізаваць праекты ўсіх трох атамных электрастанцый, якія будуць пабудаваны на яе тэрыторыі, заявіў прэзідэнт рэспублікі Таіп Эрдаган падчас выступлення ў Анкары. «Мы плануем пачаць эксплуатацыю АЭС «Акую» ў Мерсіне ў 2023 годзе. Працягваецца работа па праекце АЭС у Сінопе. І цяпер мы пачалі папярэднюю падрыхтоўку да рэалізацыі праекта трэцяй АЭС», — сказаў ён.

### АПЕК запэўніла ў хуткім росце сусветнага попыту на нафту

Арганізацыя краін — экспарцёраў нафты (АПЕК) павысіла прагноз сусветнага попыту на нафту ў 2017 годзе і да канца гэтага дзесяцігоддзя. У картэлі чакаюць, што зніжэнне цэн стымулюе спажыванне ва ўмовах замаруджвання эканамічнага росту. Пра гэта гаворыцца ў штогадовым прагнозе АПЕК World Oil Outlook. Попыт на нафту ў 2017 годзе павялічыцца да 95,3 мільёна бараляў у суткі, што на 300 тысяч бараляў больш за папярэдні прагноз, апублікаваны ў снежні мінулага года. У 2020 годзе спажыванне дасягне 98,3 мільёна бараляў кожныя суткі, што на 900 тысяч больш за папярэдні прагноз.



ISSN 1990 - 763X
16216>
9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Яйкі памяншаюць верагоднасць інсульту



Спецыялісты з ЗША прааналізавалі звесткі даследаванняў, праведзеных у перыяд паміж 1982 і 2015 гадамі. Яны вывучалі сувязь паміж спажываннем яек, ішэмічнай хваробай сэрца і інсультамі. Даследчыкі высветлілі: рэгулярнае ўжыванне аднаго яйка ў дзень зніжала рызыку інсульту на 12%, паведамляе The Times of India. У адным вялікім яйку змяшчаецца шэсць грамаў бялку, антыаксіданты лютэін і зеаксанцін, а таксама вітаміны E, D і A. Як вядома, антыаксіданты абараняюць ад акісляльнага стрэсу і запалення. А бялок дапамагае знізіць крывяны ціск. Дарэчы, супрацоўнікі Масачусецкага шпіталя папярэджваюць: рэгулярнае спажыванне бялкоў жывёльнага паходжання, якія змяшчаюцца, напрыклад, у чырвоным мясе і яйках, небяспечна для жыцця некаторых людзей. У прыватнасці, жывёльныя бялкі павышаюць рызыку заўчаснай смерці ў тых, хто вядзе няправільны лад жыцця, пакутуе ад атлусцення або мае недастатковую вагу.

## СЁННЯ — ПРАМАЯ ЛІНІЯ

### САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА: ШТО ГАРАНТУЕ ДЗЯРЖАВА?

Трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю? Не ведаеце, куды звярнуцца? Хочаце ўдакладніць, ці маеце права на дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу? А можа, ёсць пытанне наконт дзіцячых дапамог? Альбо трэба даведацца, якія перыяды работы ўваходзяць у страхавы стаж пры назначэнні пенсіі?

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць на прамой лініі госцю нашай рэдакцыі — **старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанне Аляксандраўне РАМАНОВІЧ**.

Тэлефануйце сёння, 9 лістапада, з 10 да 11 гадзін па тэлефоне 8 (017) 287-18-71.




## ЗНЯТЫ АПАВЯШЧАЛЬНІК ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ТРАГЕДЫІ

### Карэспандэнты «Звязды» выехалі ў рэйд разам з ратавальнікамі

**5 лютага ў 6.14 раніцы на пульт дзяжурнага Пухавіцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях паступіла паведамленне аб тым, што гарыць жылы дом у вёсцы Кляцішына. Ратаўнікі былі на месцы ўжо праз 12 хвілін. Аказалася, што адкрытым полымем гарыць дах дома. Заняўся і хлеў. У доме жылі муж і жонка. Ён — 1930 года нараджэння, яна — 1938-га. Іх целы знайшлі праз 15 хвілін...**



Фота Надзеі БУЖАН.

А пасля таго як пажар патушылі, у верандзе, якую агонь не паспеў знішчыць, знайшлі два аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. Яны там... ляжалі ў пакеце. А калі б знаходзіліся там, дзе належыць, то дзвюх смерцяў проста б не было. Тым больш што старыя былі апрануты. Бабуля імкнулася выпаўзці з дома, але ёй не хапіла некалькіх метраў...

### Што «далі» дачнікі?

— Нашы работнікі і спецыяльная камісія шмат разоў наведвалі гэты дом, — расказвае першы **намеснік начальніка Пухавіцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Ігар БАРОДЗЬКА.** — Пры чарговым абследаванні ў ліпені 2015 года выявілася, што кудысьці прапаў аўтаномны пажарны апавяшчальнік, які там устанаўлівалі за кошт бюджэту.

СТАР. 4

# Дазваніцца да віцэ-спікера

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На працягу дзвюх гадзін намеснік старшыні адказвала на пытанні, якія хвалююць грамадзян. На «прамую тэлефонную лінію» звярнуліся дзевяць чалавек з розных рэгіёнаў краіны. Было зададзена 27 пытанняў.

Узнятыя праблемы тычыліся практыкі прымянення законаў Рэспублікі Беларусь у сацыяльна-працоўнай сферы, у прыватнасці грамадзян цікавіла рэалізацыя Закона Рэспублікі Беларусь «Аб альтэрнатыўнай службе». Таксама ўносіліся прапановы па ўдасканаленні асобных нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць дзейнасць у галіне рэканструкцыі і будаўніцтва жылля, падаткаабкладання, аплаты працы работнікаў сацыяльнай сферы, фарміравання тарыфаў на паслугі для насельніцтва, латарэйную дзейнасць.

Марыяна Шчоткіна дала тлумачэнні і рэкамендацыі па ўсіх закранутых грамадзянамі пытаннях, рашэнне асобных з іх узяла на кантроль.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ПАТРЭБНЫ НАМ БЕРАГ ТУРЭЦКІ

**Беларуска-турэцкі бізнес-форум пройдзе ў Мінску 11 лістапада. Адпаведная інфармацыя размешчана на афіцыйным сайце Беларускай гандлёва-прамысловай палаты (БелГПП), паведамляе БЕЛТА.**

У ходзе бізнес-форуму будуць разгледжаны перспектыўныя напрамкі развіцця двухбаковага гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва. Беларускія ўдзельнікі атрымаюць магчымасць правесці перагаворы з кіраўнікамі турэцкіх кампаній, зацікаўленымі ў развіцці супрацоўніцтва ў сферах прамысловасці, гандлю, інвестыцый, будаўніцтва, турызму і іншых.

Форум праводзіцца Беларускай гандлёва-прамысловай палатай сумесна з Саветам па знешнеэканамічных сувязях Турцыі (DEIK).

# Прэзідэнт выказаў спачуванне

**Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні родным і блізкім былога сакратара Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалая Лазавіка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Як паведамлялася, Мікалай Лазавік памёр 5 лістапада. Прычынай смерці стала цяжкая хвароба.

Мікалай Лазавік нарадзіўся ў 1951 годзе ў вёсцы Невіняны Вілейскага раёна Мінскай вобласці. У 1972 годзе скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, у 1993 годзе — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, у 2000 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце, у 2003 годзе — аспірантуру пры Акадэміі кіравання. Меў навуковую ступень кандыдата эканамічных навук. Раней Мікалай Лазавік быў дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання, уваходзіў у камісію па дзяржаўным будаўніцтве і мясцовым самакіраванні. Пост сакратара ЦВК ён займаў з 2000 года. Быў вызвалены ад гэтай пасады 17 кастрычніка 2016 года па стане здароўя ўказам кіраўніка дзяржавы.

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю былога сакратара Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ЛАЗАВІКА Мікалая Іванавіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання, былога сакратара Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ЛАЗАВІКА Мікалая Іванавіча і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з прычыны смерці былога сакратара Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалая Іванавіча ЛАЗАВІКА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю былога сакратара Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ЛАЗАВІКА Мікалая Іванавіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім у сувязі з напаткаўшым іх непапраўным горам.**

■ З нагоды

# Дыялог культур — формула супрацоўніцтва

**Заўтра распачынаюцца Дні культуры Таджыкістана ў Беларусі. Аб іх правядзенні кіраўнікі нашых краін дамовіліся яшчэ два гады назад падчас візіту Эмамалі Рахмона ў Мінск. Летась з поспехам прайшлі Дні культуры Беларусі ў Таджыкістане, а цяпер мы чакаем творчы дэсант з Душанбэ. Аб тым, што падрыхтавалі для беларускага гледача сярэднеазіяцкія таленты, а таксама аб стасунках, якія робяць нашы геаграфічна аддаленыя краіны бліжэйшымі адна да адной, расказвае Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Таджыкістан у Рэспубліцы Беларусь Казідаўлат КАІМДОДАЎ.**



Фота БЕЛТА.

***— Казідаўлат Каімдодавіч, як правіла, падчас Дзён культуры краіна, якая іх прадстаўляе, імкнецца паказаць самае лепшае ў розных мастацкіх жанрах. Што прывязуць у Мінск таджыкскія творцы?***

— Апошні раз мы прывозілі ў Мінск Дні культуры ў 2008 годзе. З таго часу з'явілася нямала творчых здабыткаў, якія зацікавяць беларускага гледача. На працягу пяці дзён (з 10 па 14 лістапада) у гэтым можна будзе пераканацца, наведаўшы разнастайныя мерапрыемствы, падрыхтаваныя нашымі творцамі. Так, запланавана канцэртная праграма з удзелам лепшых майстроў мастацтваў Таджыкістана. На выставе нацыянальнага выяўленчага мастацтва будзе прадстаўлена чатыры дзясяткі карцін. Здабыткі нацыянальнага кіно — стужкамі «Таджыкфільма» «Заход світання» і «Настаўнік». Несумненна, цікавым для беларускага гледача будзе паказ калекцыі твораў майстроў народных мастацтваў. Яшчэ адзін цікавы момант — прэзентацыя кнігі п'ес вядомага беларускага драматурга Аляксея Дударава на таджыкскай мове.

Асобна хачу заўважыць, што мы надаём падобным мерапрыемствам вялікае значэнне, разумеючы, што дыялог культур — гэта формула наладжвання супрацоўніцтва ў палітычнай і эканамічнай сферах.

***— Калі гаварыць пра супрацоўніцтва нашых краін менавіта ў гэтых абласцях, актыўна развіваюцца і міжпарламенцкія, і гандлёва-эканамічныя стасункі. Асаблівая стаўка зроблена на вытворчую кааперацыю. Якія перспектыўныя праекты бачацца ў гэтым кірунку?***

— Маючы на ўвазе вопыт Беларусі, варта звярнуць асаблівую ўвагу на паглыбленне супрацоўніцтва ў навуковай сферы — для развіцця высокіх тэхналогій, абмену вопытам. Тут узаемадзейнічаюць нашы акадэміі навук, навучальныя ўстановы, зацікаўленыя прадпрыемствы.

Акрамя таго, у нас ёсць нявыкарыстаныя магчымасці ў галіне фармацэўтыкі. У далейшым можна разгледзець пытанне стварэння сумеснай вытворчасці лекавых прэпаратаў на тэрыторыі Таджыкістана з выкарыстаннем мясцовай сыравіны — беларускіх лекавых раслін.

Можна казаць і аб супрацоўніцтве ў сферах жывёлагадоўлі і насенняводства, уключаючы вырошчванне насення бульбы. Актуальнае пытанне пастаўкі экалагічна чыстых ранняй гародніны і садавіны з Таджыкістана на рынкі Беларусі. Напрыклад, можна арганізаваць дастаўку такіх тавараў наземным транспартам і паветраным шляхам...

***— Нашы краіны актыўна супрацоўнічаюць і ў межах інтэграцыйных аб'яднанняў — СНД, АДКБ, Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Таджыкістан мяжуе і з ЕАЭС, членам якой з'яўляецца Беларусь. Шмат гаворыцца аб перспектывах пашырэння гэтага эканамічнага саюза. Як на гэту перспектыву глядзяць у Душанбэ?***

— Пытанні, звязаныя з дзейнасцю ЕАЭС і магчымасцю ўступлення Таджыкістана ў гэты саюз, знаходзяцца на стадыі вывучэння і аналізу. Неабходна вызначыць і прапрацаваць усе плюсы і мінусы далучэння. Наш лідар Эмамалі Рахмон заявіў аб неабходнасці вывучэння эканамічнай базы і прававых дакументаў Еўразійскага саюза з мэтай «магчымага далейшага ўваходжання ў гэта новае інтэграцыйнае аб'яднанне». Пры гэтым хачу адзначыць, што краіны — члены ЕАЭС з'яўляюцца асноўнымі гандлёвымі партнёрамі Таджыкістана.

Сусветная практыка паказвае, што для ўступлення ў падобныя аб'яднанні неабходна мець надзейную эканамічную базу альбо для пераходнага перыяду — падушку бяспекі. Напрыклад, калі мы сёння здымем усе мытныя пошліны, якія прыносяць у бюджэт пэўнае папаўненне, дзе мы знойдзем гэтыя грошы заўтра? Такая падушка бяспекі была ў краінах, якія выказалі жаданне ўступіць у саюз, пра які мы гаворым. Спецыялістам неабходна думаць аб гарманізацыі тарыфаў. Сёння ў гэтым кірунку працуюць экспертныя групы, але трэба таксама ўлічваць фактар сусветнага крызісу і розных санкцый.

Вядома, краінам трэба аб'ядноўвацца, але рабіць гэта з улікам уласных інтарэсаў.

***— Вяртаючыся да тэмы Дзён культуры вашай краіны. Несумненна, сярод беларусаў знойдуцца тыя, хто, натхніўшыся прыгажосцю і экзотыкай сярэднеазіяцкай культуры, захоча пабываць у Таджыкістане. На што найперш варта звярнуць увагу спакушанаму турысту?***

— Тым, хто хоча не толькі адпачыць, але і паправіць здароўе, можна параіць прыехаць у нашы санаторыі «Гармчашма», «Бахарыстон». Што тычыцца актыўнага адпачынку, Таджыкістан, 90% тэрыторыі якога займаюць высокія горы, можа прапанаваць альпінізм, вельмі папулярны ў нас. Акрамя таго, турыстам звычайна цікава паспрабаваць рафтынг — сплаў па горнай рацэ, і гэта практыкуецца ў нас. Развіваецца і спартыўны кірунак — велатурызм і мотатурызм. Дарэчы, улетку 2013 года адбылася першая велаэкспедыцыя беларусаў у розныя куткі Таджыкістана — Пенджыкент і Памір.

У цэлым можна сказаць, што Камітэт моладзі, спорту і турызму Таджыкістана і Міністэрства спорту і турызму Беларусі вядуць даволі актыўную работу па развіцці гэтай важнай сферы, і ў гэтым супрацоўніцтве таксама бачныя добрыя перспектывы ■

■ Стандарты

# НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ ЯКАСЦІ

## Арганізацыі краіны павінны перайсці на новы ўзровень менеджменту якасці — СТБ ISO 9001-2015 да 15 верасня 2018 года

**Па словах старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктара НАЗАРАНКІ, выкарыстанне міжнародных стандартаў пры вырабе прадукцыі здольна забяспечыць уваход на рынкі краін блізкага і далёкага замежжа.**

«Сёння ўсе краіны гэта разумеюць. Ва ўсім свеце сур'ёзна развіваюцца сістэмы вымярэнняў, выпрабаванняў, эталонныя базы. Кожная дзяржава імкнецца не адстаць ад іншых канкурэнтаў і атрымаць поспех у навукова-тэхнічным прагрэсе», — адзначыў Віктар Назаранка. Так, новая версія дзяржаўнага стандарту на сістэмы менеджменту якасці СТБ ISO 9001-2015, ідэнтычнага міжнароднаму стандарту, дзейнічае ў Беларусі ўжо з 1 сакавіка 2016 года. Арганізацыі краіны павінны паступова ажыццявіць пераход на новы ўзровень менеджменту якасці да 15 верасня 2018 года. Такі тэрмін устаноўлены для ўсіх дзяржаў, якія ўваходзяць у Міжнародную арганізацыю па стандартызацыі (ISO). Пры гэтым асноўны акцэнт для забеспячэння выпуску якаснай і канкурэнтаздольнай прадукцыі, згодна з патрабаваннямі стандарту, зроблены на канцэпцыю аналізу рызык па ўсіх кірунках дзейнасці арганізацыі, узмацненне ролі лідарства, пабудову сістэмы ведаў і ўкаранення інавацый.

**Дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі Ірына АСМОЛА** адзначыла, што комплекс мер для стымулявання ўкаранення ў эканоміку краіны перадавых методык і сучасных міжнародных сістэм кіравання якасцю будзе рэалізаваны ў 2016—2020 гадах. Ён быў распрацаваны і прыняты ў рамках даручэння Прэзідэнта падчас яго звароту з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. Комплекс мер зацверджаны прэм'ер-міністрам Андрэем КАБЯКОВЫМ.

У адпаведным дакуменце пазначаны дзеянні і крокі, якія будуць ажыццяўляцца на ўзроўні дзяржавы па ўкараненні тэхналогій, без якіх немагчыма паспяхова канкурыраваць на сусветным рынку. У яго ўвайшло каля 45 мерапрыемстваў. Шэраг з іх будуць накіраваны на ўкараненне міжнародных і еўрапейскіх стандартаў пры выпуску прадукцыі. Таксама ў дакуменце ўдзелена асаблівая ўвага неабходнасці актыўнага ўдзелу інжынерна-тэхнічнага персаналу арганізацый у саміх працэсах стандартызацыі як на нацыянальным, так і міжнародным узроўні. Не абмінулі і стымуляванне ўкаранення ў арганізацыях рознай формы ўласнасці перадавых тэхнік эфектыўнага менеджменту. «Асобна будзе разглядацца пытанне стварэння новага конкурсу ў краіне, прысвечанага якасці беларускай прадукцыі. Ён будзе незалежным ад вытворцаў і фінансавацца з дзяржаўнага бюджэту», — дадала Ірына Асмола.

Акрамя таго, **намеснік дырэктара Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі Мікалай БАКАВЕЦ** адзначыў, што ў краіне рэалізуецца дзяржаўная навукова-тэхнічная праграма «Эталоны Беларусі» на 2016—2020 гады. Яна прадугледжвае распрацоўку больш як 20 эталонаў для развіцця атамнай энергетыкі і звязаных з ёй тэхналогій, сферы IT, галін прамысловасці, будаўніцтва і сельскай гаспадаркі, геадэзіі, абароны ад надзвычайных сітуацый і іншых, а таксама мадэрнізацыю 6 наяўных. Цяпер у Беларусі дзейнічаюць 53 эталоны.

**Даведка «Звязды»**

*Больш за 25 гадоў у другі чацвер лістапада па ініцыятыве Еўрапейскай арганізацыі па якасці пры падтрымцы ААН адзначаецца Сусветны дзень якасці. Сёлета ён адзначаецца 10 лістапада. Таксама з 7 па 13 лістапада праходзіць Еўрапейскі тыдзень якасці.*

*Дзеючая сёння ў краіне нарматыўная тэхнічная база ахоплівае практычна ўсе галіны эканомікі. Сёлета ў Беларусі прынята больш за 1000 дзяржаўных стандартаў (СТБ і ДАСТ). Найбольшая колькасць з іх — у машынабудаванні, электратэхніцы, радыёэлектроніцы і сувязі, хіміі і нафтахіміі, будаўнічай індустрыі, харчовым сектары. Узровень гарманізацыі прынятых дзяржаўных стандартаў з міжнароднымі і еўрапейскімі патрабаваннямі перавышае 50%. Стандарты такога высокага ўзроўню з'яўляюцца магутнай падтрымкай айчыннай прамысловасці і бізнесу ў фарміраванні стратэгіі стварэння новых відаў прадукцыі, якая адпавядае сучасным патрабаванням і забяспечвае канкурэнтаздольнасць на глабальным узроўні.*

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by* ■

■ Марафон дабрыні

# «ДОБРАЕ СЭРЦА» ДЛЯ КІРЫ

**Сёння дабрачынны марафон «Усе фарбы жыцця для цябе», ідэйным натхняльнікам якога выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, зробіць прыпынак у Гомелі.**

Тут нераўнадушныя людзі будуць збіраць грашовыя сродкі на лячэнне трохгадовай Кіры Куруленкі з Буда-Кашалёва, якой сёлета ўрачы паставілі дыягназ «дзіцячы рак». Дзяўчынка ўжо прайшла шэсць блокаў хіміятэрапіі. Наперадзе — аперацыя па выдаленні пухліны, абследаванне і лячэнне ў Маскве, пасля якіх Кіру чакае аперацыя па перасадцы ствалавых клетак у ізраільскай клініцы. Кошт апошняй — 250 тысяч долараў. Чацвёртая частка ад патрэбнай сумы ўжо сабрана. Творчая дабрачынная праграма марафону «Усе фарбы жыцця для цябе» з удзелам валанцёраў руху «Добрае Сэрца», ансамбля «Песняры», заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Наталлі Тамелы, папулярных гуртоў «Цвет Алоэ», «PROвокация», а таксама маладых выканаўцаў Вольгі Калеснікавай, Аляксандры Няхай, Эліны Матарас, Надзеі Місяковай і іншых адбудзецца ў Гомельскім абласным грамадска-культурным цэнтры. Усе выручаныя ад продажу білетаў сродкі будуць пералічаны на лячэнне Кіры Куруленкі. У фае валанцёры БРСМ разгорнуць інтэрактыўныя пляцоўкі «Сцяна пажаданняў для Кіры», «Пескаграфія».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by* ■

■ Надвор'е

# МЕСЦАМІ ПРЫ ПРАЯСНЕННЯХ ДА -12 °C

## А НОЧЧУ Ў ЧАЦВЕР У ЦЭНТРАЛЬНЫХ І ПАЎДНЁВЫХ РАЁНАХ СІНОПТЫКІ АБЯЦАЮЦЬ ПРАЦЯГЛЫЯ І МОЦНЫЯ СНЕГАПАДЫ

**Калі ў мінулыя некалькі сутак на тэрыторыі краіны гаспадарыла дажджлівая восень, то ўжо на гэтым тыдні пахаладае і зноў пойдзе снег. Начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Белгідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ паведаміў, што на працягу тыдня пахаладае, сярэдняя тэмпература паветра чакаецца на 3—5 градусаў ніжэй за норму.**



Сёння ўдзень да нас завітаюць атмасферныя франты, якія рухаюцца з боку паўднёвага захаду Еўропы. Удзень на большай частцы тэрыторыі ападкі (мокры снег, дождж), па поўдні моцныя ападкі. У асобных раёнах туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень ад мінус 1 градуса да 5 цяпла, а па поўначы мінус 2 — мінус 3 градусы. У чацвер атмасферныя франты будуць перамяшчацца далей у паўночна-ўсходнім напрамку і прынясуць уначы працяглы снег, мокры снег, па паўднёвым усходзе з дажджом, а ў цэнтральных і паўночных раёнах ападкі чакаюцца сапраўды моцныя. Нават удзень паўсюдна будзе ісці кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, па паўночным захадзе — да 7 марозу; удзень будзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў.

А далей наша краіна трапіць пад уплыў яшчэ больш халодных паветраных мас з поўначы Еўропы. Сіноптыкі абяцаюць у пятніцу кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе стабільна адмоўнай — ад 2 да 9 марозу, а па паўночным захадзе пры праясненнях да мінус 12 градусаў. Удзень таксама халадна — ад мінус 6 градусаў да плюс 1.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, на выхадныя стане яшчэ халадней. У суботу ў асобных раёнах пройдзе кароткачасовы снег, на дарогах чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—8 марозу, пры праясненнях — да мінус 9 — мінус 13 градусаў; удзень — ад 0 да мінус 6 градусаў. Кароткачасовы снег і мокры снег прагназуюцца па паўднёва-ўсходняй палове краіны і ў нядзелю. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да мінус 8 градусаў, пры праясненнях — 9—13 марозу; удзень — ад мінус 5 да плюс 2 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

# З КАНВЕЕРА — У РЭКАРДСМЕНЫ

## МТЗ незвычайна прадставіў самую магутную мадэль сваёй лінейкі трактароў

**Прэзентацыя новага «Беларуса-4552» магутнасцю 450 конскіх сіл адбылася днямі на прызаводскай плошчы.**



Фота БЕЛТА.

Машына з'яўляецца ўласнай распрацоўкай МТЗ, яна стала самай магутнай з усіх, што выпускаюцца на прадпрыемстве, і адной з самых магутных у свеце. Для першага паказу быў выбраны незвычайны фармат — тэхніку вагой 18 тон пры дапамозе ўласных цягліц адбуксіравалі на 6,1 метра ганаровы старшыня Беларускай федэрацыі сілавога мнагаборства Дзмітрый Белайц і пераможца Arnold Amateur Strongman World Championships 2013, расіянін Міхаіл Шыўлякоў.

Новы «Беларус» з'яўляецца трактарам агульнага прызначэння. Машына мае шаснаццаць перадач пярэдняга і восем — задняга ходу, яна абсталявана моцным рухавіком Caterpillar, які змяншае колькасць шкодных выкідаў, сучаснай трансмісіяй, камфортнай кабінай, сістэмамі адбору магутнасці і навяснымі сістэмамі. Мяркуецца, што мадэль знойдзе прымяненне на самым цяжкіх і энергаёмістых работах у сельскай гаспадарцы. Асабліва эфектыўным стане яе выкарыстанне ў краінах з вялікімі пасяўнымі плошчамі, напрыклад, у Расіі і Казахстане.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# КАМАРОЎКА — ТЭРЫТОРЫЯ ЗНІЖАК

## Сёння цэны тут будуць меншымі на 15—25 працэнтаў

**Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінскі Камароўскі рынак» 9 лістапада абвясціла днём 15—25-працэнтных зніжак, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Так, на 20 працэнтаў будуць меншымі сёння цэны на садавіну і гародніну, якія прадаюцца ў сезоннай частцы рынку. А таксама на мясныя паўфабрыкаты, мяса птушкі, спецыі, сухафрукты, арэхі, бакалею, свежамарожаную рыбу, штучныя і жывыя кветкі. Танней на 15—20 працэнтаў будуць каштаваць кандытарскія і каўбасныя вырабы. Зніжка ў 20 працэнтаў прадугледжана на абедзеннае меню ў сталовай, печыва ўласнай вытворчасці, кулінарыю, разліўную каву. У гандлёвым павільёне крытай часткі рынку пакупнікам прапануюць на 25 працэнтаў меншыя цэны на абутак.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*



■ Погляд

# УЗАЕМАДАПАЎНЯЛЬНАСЦЬ У МНОГІХ ГАЛІНАХ

## Вынікі візіту Прэзідэнта на Блізкі Усход



**Аб'яднаныя Арабскія Эміраты і Катар з'яўляюцца дзяржавамі з невялікім насельніцтвам, але з сапраўды сур'ёзным значэннем у сусветнай геапалітыцы і геаэканоміцы. Той фактар, што ў абедзвюх краінах жыве менш людзей, чым у адной Беларусі, перакрываецца іншымі важнымі момантамі, якія робяць названыя дзяржавы жаданымі партнёрамі не толькі для Беларусі, але і для многіх краін.**

Перш за ўсё, ААЭ і Катар знаходзяцца ў галоўным па запасах залежаў нафтаносным раёне свету, і ў шасці краін Персідскага заліва (Катар і ААЭ ўваходзяць у цесны блок з Саудаўскай Аравіяй, Бахрэйнам, Аманам і Кувейтам) знаходзіцца ў распараджэнні больш за трацiну ўсіх сусветных запасаў нафты. Інтэнсіўная здабыча нафты і яе экспарт дазваляюць ААЭ і Катару мець важную ролю ў забеспячэнні энергетычнай незалежнасці дзясяткаў краін свету, уключаючы Кітай, Індыю і Іран. У сусветных рэйтынгах па здабычы нафты ААЭ на восьмым месцы, а Катар на чатырнаццатым. Гэта азначае, што ААЭ здабывае нафты толькі ў чатыры разы менш, а Катар — у пяць разоў, чым лідар сусветнага рэйтынгу — Расія.

Акрамя нафты, Катар таксама мае вялікі экспартны патэнцыял па газе. Дзяржава прыклала вялізныя намаганні па будаўніцтве магутнасцяў па звадкаванні газу, што дазваляе экспартаваць яго па ўсім свеце. Трэцяе месца ў свеце па здабычы газу робіць Катар важным іграком на гэтым рынку. Вынікам дзесяцігоддзяў паспяховага забеспячэння краін свету энергарэсурсамі сталі велізарныя фінансавыя рэсурсы ў распараджэнні ААЭ і Катара. Золатавалютныя рэсурсы ААЭ складаюць 78 мільярдаў долараў, а Катара — 36,7 млрд. Але гэтыя лічбы цьмянеюць на фоне тых сродкаў, якія ў гэтых дзвюх краін укладзеныя ў нацыянальныя суверэнныя фонды. Па памеры актываў фонд ААЭ займае трэцяе месца ў свеце, а Катара — дзявятае. У ААЭ аб'ём сродкаў складае 792 мільярды долараў, а ў Катара — 335 млрд. І грошы гэтыя інвестуюцца і працуюць па ўсім свеце, што робіць дзве краіны жаданымі інвестарамі для многіх. Наступнай асаблівасцю з'яўляецца вялікая роля дзвюх краін у сусветных мас-медыя. У прыватнасці, створаны параўнальна нядаўна ў Катары тэлеканал Аль-Джазіра стаў магутным сродкам уплыву на сусветную грамадскасць.

Нядзіўна, што ў сілу гэтых фактараў Беларусь заўсёды адчувала цікавасць да развіцця супрацоўніцтва з гэтымі краінамі. Візіт Прэзідэнта стаў яшчэ адным пацвярджэннем для партнёраў з рэгіёна, што Беларусь настроена сур'ёзна і розныя варыянты па развіцці ўзаемадзеяння можна і трэба абмяркоўваць.

Несумненна, што найбольшы патэнцыял развіцця адносін ляжыць у вобласці прыкладання вялізнага інвестыцыйнага патэнцыялу дзвюх краін на тэрыторыі Беларусі. Першы паспяховы прыклад такога роду — шматфункцыянальны гасцінічна-спартыўны комплекс, пабудаваны на праспекце Пераможцаў у Мінску, у які катарскія інвестары ўклалі 160 мільёнаў долараў.

Нягледзячы на тое, што інвестары з краін Персідскага заліва ў асноўным укладваюць актывы ў гасцініцы, лагістычныя цэнтры і банкі, для іх у Беларусі будуць прапанаваныя і іншыя магчымасці. У прыватнасці, перспектыўным выглядае супрацоўніцтва ў сферы вытворчасці прадукцыі дрэваапрацоўкі. Тэрыторыя ААЭ і Катара традыцыйна пакутуе ад недахопу лясоў, а наша тэрыторыя на сорак працэнтаў пакрыта лесам. У наяўнасці — магчымасць узаемнага дапаўнення нашых эканомік.

Падобныя магчымасці ляжаць і ў сферы вытворчасці прадуктаў харчавання. Рэгулярныя візіты дэлегацый з Катара і ААЭ ў Беларусь дазволілі высокапастаўленым прадстаўнікам гэтых краін на асабістым вопыце пераканацца ў высокай якасці айчынных прадуктаў харчавання. Малочныя прадукты з Беларусі ўжо актыўна прысутнічаюць на рынку ААЭ, у наяўнасці магчымасці па стварэнні сумесных прадпрыемстваў для стымулявання далейшага нарошчвання беларускага экспарту на гэтыя рынкі.

Адным з самых перспектыўных кірункаў супрацоўніцтва павінна стаць кааперацыя ў сферы развіцця высокіх тэхналогій. Кіраўніцтва Катара і ААЭ разумеюць магчымыя праблемы празмернай залежнасці ад экспарту энергарэсурсаў для сваіх эканомік. Таму поўным ходам рэалізуюцца праграмы па стварэнні новых галін эканомікі, у тым ліку тых, якія завязаныя на высокія тэхналогіі, што сталі неад'емнай часткай самых даходных сфер бізнесу XXI стагоддзя. Беларускі Парк высокіх тэхналогій, установы Нацыянальнай акадэміі навук добра вядомыя ў Катары і ААЭ. Тут ужо магчымыя праграмы супрацоўніцтва як на тэрыторыі Беларусі, так і на тэрыторыі краін-партнёраў.

Велізарны зачын ляжыць у сферы турызму. Пакуль што пляжы і аазісы арабскіх краін больш вядомыя беларусам, чым лясы, санаторыі і аграсядзібы Беларусі грамадзянам Катара і ААЭ. Між тым беларуская прырода з'яўляецца пэўнай экзотыкай для жыхароў пустынь, што дазваляе спадзявацца на рост патоку турыстаў. У той жа час, запрашаючы гасцей з гэтага рэгіёна ў турыстычны сектар краіны, неабходна ўлічваць іх асаблівыя патрабаванні да камфорту.

Нарэшце, трэба працягваць палітыку па экспарце прадукцыі беларускага машынабудавання ў гэтыя краіны. МЗКЦ і МАЗ ужо маюць пэўныя поспехі на рынках Катара і ААЭ, іх трэба замацоўваць, а іншым беларускім прадпрыемствам — актыўна далучацца.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук** ■

# ЛЁГКІХ ДЗЯЖУРСТВАЎ ТУТ НЕ БЫВАЕ



Часта пацыенту ставіцца кропельніца ў машыне хуткай дапамогі па дарозе ў бальніцу.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Змена брыгады 1054, за работай якой нам давялося назіраць, пачалася ў дзевяць гадзін раніцы. Скончыцца праз дваццаць чатыры гадзіны. Але па такім раскладзе працуюць не ўсе. Супрацоўнікі самі выбіраюць, якія змены для іх зручнейшыя: дзённыя, начныя ці сутачныя. Заступіць на работу можна ў восем або дзевяць (раніцы і вечара) гадзін, акрамя таго, ёсць спецыяльная начная змена з дзевятнаццаці, каб не ўзнікала накладак, пакуль адныя брыгады мяняюць другія.

Святлана амаль заўсёды працуе сутакмі. У гэтым месяцы, напрыклад, у яе атрымаецца 12 дзяжурстваў.

**«Алергія ў такім узросце неймаверна небяспечная. У гэтым выпадку тры кедравыя арэшкі выклікалі бурную рэакцыю, бацькі правільна зрабілі, што патэлефанавалі нам».**

— Ці не цяжка мне? Вы што, я неймаверна люблю сваю працу! Прыйшла на «хуткую» ў 1989 годзе і ні разу за ўсе гады не пашкадавала аб зробленым выбары, — кажа фельдшар. — Хаця, безумоўна, хапала ўсякага. Адчыняеш дзверы, а там вялізныя сабакі проста на цябе скачуць ці неўвярозы мужчына з сякерай нясецца... Але ўсё гэта забываецца на фоне паспяхова праведзеных рэанімацый, калі ты бачыш вынікі сваёй працы — жывых людзей.

Медсястра Ірына Ізотава, напарніца Святланы, таксама любіць сваю прафесію за дапамогу, якую аказваеш «тут і цяпер».

— Пакуль знаходзішся на дзяжурстве, стомленасці не адчуваеш. Адзін выклік меняе другі. Работа не надакучвае хаця б таму, што ты ўвесь час бачыш новых людзей, сутыкаешся з рознымі сітуацыямі, — дзеліцца медсястра. — На мой погляд, самыя страшныя выклікі паступаюць ад анкалагічна хворых. Маральна цяжка бачыць, як паміраюць жанчыны і мужчыны працаздольнага ўзросту, моладзь і дзеці. І ты ўжо не можаш ім дапамагчы. Адзінае, што ад цябе патрабуецца — прытупіць боль ці перавезці пацыента з кватэры ў хоспіс.

За размовамі праходзіць дзве гадзіны. Святлана і Ірына здзіўляюцца такому зацішшу і жартуюць, што гэта, напэўна, перад бурай.

І вось першы выклік. Акрамя таго самага аранжавага чамаданчыка, у якім месцяцца некалькі дзясяткаў шкляначак з лекамі, медсястра бярэ з сабой партатыўны кардыёграф: «У залежнасці ад прычыны, па якой выклікаюць, мы можам памераць артэрыяльны крывяны ціск, тэмпературу цела, колькасць кіслароду і цукру ў крыві, зрабіць кардыяграму».

92-гадовая жанчына з арытміяй — пастаянная пацыентка дзясятай падстанцыі хуткай медыцынскай дапамогі. Прыязджаем на месца. Нас у кватэру не пускаюць, таму мы чакаем каля дзвярэй.

— Тыповы выпадак, якіх у нас бывае шмат. Выканалі стандартныя працэдуры: зрабілі ЭКГ, увялі неабходныя лекі, — канстатуе Святлана, выходзячы на вуліцу. — Як бачыце, наша работа зусім не такая, якой яе паказваюць у кіно.

Наступны пацыент, які чакае дапамогі, 22-гадовая дзяўчына з падазрэннем на страўнікава-кішачны крывацёк. Яе неабходна перавезці з паліклінікі ў бальніцу. Даша (так завуць дзяўчыну) расказвае, што сёлета скончыла ўніверсітэт і пачала жыць асобна ад бацькоў. Пра нармальную хатнюю ежу адразу забылася і пачала харчавацца ў асноўным фастфудам, асабліва палюбіліся ёй булачкі і кава.

— Не ўяўляла, што гэта можа прывесці да сур'ёзных наступстваў, — прызнаецца дзяўчына, разглядаючы кропельніцу, якую ёй устанавілі ў машыне «хуткай».

Адразу з бальніцы мы накіроўваемся туды, дзе нас ужо чакаюць пэўны час. Дзверы адчыняе мужчына-інвалід 68 гадоў. Яму другі дзень запар не дае спакою востры галаўны боль.

— Я ўжо і таблетак напіўся, але яны не дапамагаюць. Зрабіце што-небудзь, — просіць ён Святлану.

Фельдшар доўга распытвае яго пра дыягназы, папярэднія візіты «хуткай», пра самалячэнне, якім ён займаецца. Прапаноўвае мужчыну паехаць у бальніцу.

— Не паеду нават пад пагрозай расстрэлу. Яны мяне там зноў да вечара «прамурыжаць», будуць рабіць абследаванні розныя. А ў выніку мне прыйдзецца дадому на таксі ехаць, бо службовую машыну не дачакацца. Я ж не мільянер! — скардзіцца той. — Зрабіце што-небудзь тут.

Ірына робіць ЭКГ, мерае ціск, паказвае вынікі фельдшару. Пасля ўводзіць неабходныя лекі. Яму становіцца лягчэй, але ці надоўга?

— Мы можам аказаць толькі першасную дапамогу. За больш сур'ёзнай неабходна звяртацца ў паліклініку ці бальніцу. Не хочаце ехаць? Калі ласка, пасля візіту да вас дадому перададзім неабходную інфармацыю ўчастковаму ўрачу. Ён сам да вас прыйдзе, але трэба пачакаць, — тлумачыць Святлана, і мы пакідаем пацыента.

Фельдшар тэлефануе дыспетчару і запытваецца, ці няма ў нас чарговага выкліку? Ёсць. У двухгадовага дзіцяці на твары з'явіўся моцны сып з невядомай прычыны. Забіраем малога разам з маці і вязём у бальніцу. «Алергія ў такім узросце неймаверна небяспечная. Можа скончыцца лятальным канцом. У гэтым выпадку тры кедравыя арэшкі выклікалі бурную рэакцыю, бацькі правільна зрабілі, што патэлефанавалі нам», — адзначае Святлана.

Пасля некалькіх гадзін бесперапынных выклікаў і раз'ездаў па горадзе мы вяртаемся на падстанцыю. На доўгачаканы абед адведзена ўсяго паўгадзіны. Супрацоўнікі «хуткай» прызвычаіліся за лічаныя хвіліны не толькі выконваць сваю работу, але і праглынаць ежу. Мы да гэтага гатовыя не былі, таму кідаем недаедзеныя «ссабойкі» і спяшаемся на чарговы выклік.

Час пік работы хуткай медыцынскай дапамогі — з шасці вечара да гадзіны ночы.

— Людзі, як правіла, церпяць боль увесь дзень, мяркуючы, што пройдзе. А пад вечар пачынаюць набіраць «103», — кажа Ірына. — Вось зараз якраз і пачнецца.

— Ніхто. Я сама даведалася, што сітуацыя ў тэатры з мецца-сапрана складаная — вядучая салістка паехала ў Францыю і засталася там жыць. А яшчэ адна спявачка збіралася ісці ў дэкрэтны адпачынак. І тады я свайго педагога Лідзію Іванаўну Галушкіну пачала прасіць: «Пойдзем у тэатр!» Яна: «Які тэатр? Ты на трэцім курсе». А пасля пагадзілася, пазваніла ў тэатр і папрасіла, каб мяне праслухалі. У прызначаны дзень я прыйшла на праслухоўванне. Камісія была строгая, сур'ёзная. Я спяваю адну арыю, другую. Просяць пачаць трэцюю. Праспявала і выйшла. Пачалося абмеркаванне. Доўга мы сядзелі ў калідоры, чакалі. Нарэшце адчыняюцца дзверы, члены камісіі выходзяць і пачынаюць віншаваць Лідзію Іванаўну. А мне кажуць: «У вас праз месяц спектакль «Яўгеній Анегін». Неадкладна пачынайце падрыхтоўку».

А што тычыцца Анісімава, то ўжо пасля мне расказалі, што на абмеркаванні галасы падзяліліся. І вось тут маэстра сказаў: «Я бачу ў гэтай дзяўчыне перспектыву...» І рашэнне было прынята на маю карысць.

***— І адразу даверылі адну з галоўных партый у спектаклі «Яўгеній Анегін» — партыю Вольгі. Не выклікала гэта з боку калег зайздрасці, нядобразычлівасці? Творчыя калектывы, як правіла, складаныя.***

— На шчасце, нічога падобнага я не адчула. Наадварот, калегі аказвалі дапамогу, падтрымку. А для чалавека, які робіць першыя крокі на прафесійнай сцэне, гэта вельмі важна. Ды і кіраўніцтва тэатра — дырэктар, кампазітар Сяргей Картэс, пасля мастацкі кіраўнік Маргарыта Ізворска-Елізар'ева, галоўны дырыжор Аляксандр Анісімаў — праявілі да мяне належную ўвагу і клопат. Магчыма таму, дэбютаваўшы ў спектаклі «Яўгеній Анегін» Чайкоўскага, у наступныя гады я выканала ў тэатры партыі Кармэн у аднайменнай оперы Бізэ, Амнерыс у оперы «Аіда» Вердзі, Марфы ў оперы «Хаваншчына» Мусаргскага, Марыны Мнішак у оперы «Барыс Гадуноў» Мусаргскага, Любашы ў оперы «Царская нявеста» Рымскага-Корсакава, Паліны ў оперы «Пікавая дама» Чайкоўскага і шэраг іншых.

**Опера вельмі памаладзела. У сорак ты павінен быць альбо зоркай, альбо сваё становішча ўжо не зменіш.**

***— І кожная з гэтых партый прыносіла вам новы поспех, ваша імя набывала папулярнасць, прызнанне. Мінскі глядач стаў хадзіць у тэатр «на Аксану Волкаву». І раптам нечакана — ва ўсякім разе, для публікі — вы апынаецеся ў Маскве. Як і чаму гэта адбылося?***

— Не, для мяне гэта не было нечаканасцю. Разумееце, каб прафесійна расці, спявак абавязаны пастаянна вучыцца, удасканальваць майстэрства. Таму я заўсёды імкнулася і імкнуся ўдзельнічаць у конкурсах, кастынгах, праслухоўваннях. Гэта вельмі карысны занятак. Ён дае магчымасць параўнаць сябе з іншымі вядомымі спевакамі, многаму ў іх павучыцца. Дык вось, будучы аднойчы на конкурсе ў Пласіда Дамінга, я даведалася, што Вялікі тэатр у Маскве аб'явіў спецыяльную Маладзёжную оперную праграму для маладых таленавітых спевакоў з краін СНД. Я тут жа адправіла заяўку. На праслухоўванне з'явілася каля чатырохсот чалавек. А выбраць трэба было ўсяго дзесяць. Сярод шчаслівчыкаў аказалася і я.

***— Пасля заканчэння Маладзёжнай праграмы вас запрасілі ў Вялікі тэатр Расіі?***

— Не, на сцэне гэтага праслаўленага тэатра я дэбютавала яшчэ падчас вучобы, у партыі Отрака ў оперы Рымскага-Корсакава «Паданне пра нябачны горад Кіцеж і дзеву Феўронню». І пасля паспяховага дэбюту мяне залічылі ў штат. Я выканала там некалькі галоўных партый, у тым ліку Кармэн, Любашы, Вольгі, Фенены. Пазней была выключана са штатных работнікаў, але засталася запрошанай салісткай.

## Побач з зоркамі

***— Вы першая беларуская спявачка, якой выпаў гонар выступіць на сцэне сусветна вядомай «Метрапалітэн-оперы». Гэта быў ваш першы прыезд у Нью-Ёрк?***

— Другі. А першы раз я прыязджала сюды крыху раней — «страхаваць» Кармэн. Па праўдзе кажучы, напачатку ад гэтага запрашэння я хацела адмовіцца. Але мой педагог здзівіўся: «Ты што, звар'яцела? Хуценька збірайся і едзь, таму што другі раз могуць і не запрасіць». Я паехала і не пашкадавала. Са мною ад пачатку і да канца зрабілі ролю, вельмі плённа папрацавалі і педагог па вакалу, і выкладчык французскай мовы. А самае галоўнае — мяне паглядзелі, як кажуць, у справе: як я спяваю, як рэагую на заўвагі, якая я ў зносінах з калегамі. Для мяне ўсё гэта з'явілася вельмі цікавым і карысным. Таму, працуючы ў «Рыгалета», мне было ўжо трохі прасцей.

***— Вашымі партнёрамі на сцэне былі оперныя зоркі першай велічыні: партыю Рыгалета выконваў серб Жэлька Лучыч, Герцага — паляк Пётр Бечала, Спарафучыле — славак Стэфан Кочан. А ў ролі Джыльды — прыма сусветнай оперы, нямецкая спявачка Дзіана Дамрау... Іх прысутнасць побач вас не бянтэжыла?***

— Наадварот, неверагодна натхняла. Мне невыказна пашанцавала працаваць з гэтымі выдатнымі спевакамі і цудоўнымі людзьмі. Уся пастаноўка спектакля праходзіла ў вельмі таварыскай і прыемнай атмасферы, з жартамі, з перапынкамі на каву і гутаркі.

***— А як вам працавалася ў дуэце з Ганнай Нятрэбкай? Не адчувалі яе зорнасці?***

— Ганна — цудоўная жанчына, добрая, шчодрая, мудрая. Ні грама высакамернасці, ні намёку на зорнасць. Мы часта сустракаліся не толькі на рэпетыцыях, шмат аб чым гутарылі і, можна сказаць, пасябравалі. А што тычыцца яе вакальных, артыстычных даных, то гэта — найвышэйшы сусветны ўзровень. Нятрэбка ў партыі Таццяны была непараўнальнай. Яна вельмі выразная, тонка адчувае рускую музыку. Такога выканання я ніколі не чула.



Дырыжор Хобард Эрл, Аксана Волкава і віяланчэлістка Далі Гуцырыева на святочным канцэрце «Музыка на ўсе часы» ў суправаджэнні аркестра Вялікага тэатра оперы і балета, кастрычнік 2016 года.

## Прыцягальнасць вяршынь

***— Агульнавядомая ісціна: добра спяваюць многія, але ў яркія зоркі прабіваюцца адзінкі. Што для гэтага, на вашу думку, трэба?***

— Я, напрыклад, не лічу, што ўжо прабілася ў зоркі, таму наўрад ці магу раздаваць парады. Я сама яшчэ і палавіны не зрабіла з таго, што магла б зрабіць.

***— У вас усё наперадзе.***

— Цяпер опера вельмі памаладзела. Ужо ў сорак гадоў ты павінен быць альбо зоркай, гэта значыць спявачкай высокага класа, альбо ты сваё становішча ўжо не зменіш. Таму я лічу, што часу ў мяне засталося не шмат. Калі я за пяць гадоў не зраблю якасны рывок наперад, то рызыкую застацца ў другім эшалоне.

***— Адчуваеце, што ёсць яшчэ нерэалізаваны патэнцыял? Дык што ж трэба, каб яго рэалізаваць?***

— Патрэбна вялізная работа над сабой, каб быць гатовай да любой нечаканай прапановы. Раптам скажуць: ты павінна заўтра спяваць Кармэн у «Метрапалітэн-опера». І трэба быць да гэтага падрыхтаванай, упэўненай, што ў цябе ідэальная французская мова, выдатная фізічная форма і ты зможаш вакальна і па-акцёрску выканаць гэту ролю.

Такім чынам, першы складнік — прафесіяналізм. Але гэтага мала. Павінна быць каманда менеджараў, якая будзе табой займацца. Тваю паступальную кар'еру павінны пралічваць прафесіяналы, менеджары, якія ў гэтай сферы докі. Я ні на міг не магу расслабіцца, вымушана ўвесь час трымаць сябе ў тонусе. Не магу сказаць, што я малайчына, калі спявала на прэстыжных сцэнах, і магу ўжо да пенсіі гэтым ганарыцца. Не. Ужо заўтра я павінна прадумаць свой будучы рэпертуар.

***— Скажыце, а ад чаго залежыць якасць спеваў? Ад здароўя, надвор'я альбо яшчэ ад чаго-небудзь?***

— Перш за ўсё — ад школы, пастаноўкі голасу. Мы ж у кансерваторыі вучымся не проста паветра выдзімаць. Майстэрства спевака ў тым і заключаецца, што нават у хваравітым стане ты ўсё роўна прагучыш. Мы здаровыя толькі летам і ў адпачынку. А так заўсёды нешта не ў парадку: то насаглотка, то насмарк, то горла баліць, то пераспяваў — навярэдзіў звязкі.

***— А наогул — ці доўгі век опернай спявачкі?***

— Усё залежыць ад таго, як ставішся да свайго голасу. Можна і ў сорак пяць яго «забіць». А можна і ў пяцьдзясят быць у выдатнай форме. Гэта залежыць ад многага — ад гігіены голасу спевака, яго інтэлекту, стану здароўя. Тут няма дробязяў. Але голас у кар'еры — гэта не ўсё. Ці, дакладней сказаць, толькі адзін са складнікаў. Усё заключаецца ў асобе спевака — у яго характары, яркай індывідуальнасці, артыстычнай энергіі, здаровых амбіцыях, у рэшце рэшт, у яго інтэлекце.

## Чароўная сіла музыкі

***— Аксана, скажыце, калі ласка, з зайздрасцю вам даводзілася сутыкацца?***

— Магчыма, і даводзілася. Усюды ж ходзяць нейкія размовы, плёткі. Гэта ёсць. У любым асяроддзі. Але я не хачу гэтага чуць, праходжу міма. Перажываць, што нехта пра мяне не тое скажа альбо не так падумае, па-мойму, вялікая недарэчнасць. У мяне ёсць кола прафесійных зносін, якое засталося пасля Маладзёжнай праграмы. Свет вакальны дастаткова вузкі. Мы сустракаемся то на адной пастаноўцы, то на другой. І ў мяне з усімі добрыя адносіны. Калі хто да мяне з дабром, то я да яго — двойчы.

***— Бываеце незадаволеныя сабою?***

— Пастаянна. Я ніколі не бываю цалкам задаволеная. У мяне шмат запісаў маіх выступленняў, і калі я іх праслухоўваю, то заўсёды знаходжу заганы. І здаецца: дайце мне яшчэ адзін шанц — і я зраблю лепш. Але бывае, што гэты шанц даюць, а атрымоўваецца горш.

***— А бывала, каб вы праспявалі так, як хацелі?***

— Так, бывала. Праўда, іншы раз унутранае адчуванне падманвала: пасля, пры праглядзе запісу, усё ж знаходзіла некаторыя заганы. Таму пасля кожнага спектакля ўважліва аналізую сваё выступленне, думаю, як у наступны раз зрабіць лепш. Няма мяжы дасканаласці.

## Пра час і пра сябе

***— Некалькі асабістых пытанняў. Якая вы па характары — моцная, слабая?***

— Я не ведаю. У нейкія моманты — моцная, а ў нейкія — слабая. Я — розная. Я — звычайная жанчына, якой часам патрэбна дапамога, маральная падтрымка. Але я ніколі не іду супраць сябе, не глытаю моўчкі крыўду. Аднойчы зразумела: калі праглыну, то крыўда будзе ўва мне жыць, тлець, і я ўвесь час буду думаць, чаму я так зрабіла, чаму нічога не адказала? Таму спрабую, вучуся рэагаваць адэкватна. У той жа час, калі мне, скажам, нахамяць у чарзе — я не звяртаю ніякай увагі.

***— Ці ёсць у вас якія-небудзь захапленні, акрамя музыкі? Напрыклад, ці знаходзіце час на чытанне кніг?***

—Так, знаходжу. Цяпер гэта вельмі зручна: бярэш айпад, загружаеш туды кнігі і ў дарозе чытаеш. Якім кнігам аддаю перавагу? Люблю раманы — каб цікавы сюжэт, з завязкаю і развязкаю. Але гэта для дарогі. А дома стараюся чытаць літаратуру пазнавальную, у прыватнасці, на тэмы здароўя.

***— Што для сучаснай жанчыны павінна быць на першым месцы — кар'ера, сям'я, забавы?***

— Сям'я, канешне. Але калі мяне цалкам акунуць у сям'ю, забраўшы ўсё астатняе, то я не ведаю, каму ад гэтага будзе дрэнна. Па-мойму, усім.

**Можна і ў сорак пяць «забіць» голас. А можна і ў пяцьдзясят быць у выдатнай форме.**

***— У чым жа ўсё-такі заключаецца шчасце?***

— Шчасце — гэта вельмі крохкае, непастаяннае паняцце. Нельга ў шчасці знаходзіцца ўвесь час. Гэта, напэўна, калі ў цябе ў нейкі момант усё добра, на ўсіх франтах. І ў рабоце ўдача, і дома наступіла поўнае ўзаемаразуменне, і калі ўсе здаровыя.

***— Ну, калі мы ўжо завялі амаль філасофскую размову, скажыце тады, Аксана, у чым, на ваш погляд, сэнс жыцця?***

— Не хварэць. Не памерці маладым. А яшчэ, напэўна, у тым, каб жыць і мець асалоду ад шчасця. І жыць гэтым не заўтра, не калі-небудзь, а сёння. Ёсць магчымасць атрымаць задавальненне — не саромейся, атрымлівай. Ёсць нагода сабрацца з сябрамі — не адкладвай на пасля, збірайся. Атрымлівай радасць ад магчымасці з'ездзіць на прыроду, даць канцэрт. Ды хіба мала чаго цудоўнага ёсць у нашым жыцці!

***— Атрымліваць задавальненне ад жыцця — несумненна, добра. Але мне здаецца, гэтага малавата. Мы прыходзім у гэты свет з пэўнай місіяй. Вось вам Бог даў талент спявачкі, і яго належыць у поўнай меры рэалізаваць.***

— Ну, можа быць... Але не магу ж я пастаянна думаць, якая ў мяне місія. Я магу толькі жыць і быць шчаслівай. І калі я буду шчаслівай, то і мае блізкія, усе, хто вакол мяне, будуць таксама шчаслівыя. Я хачу сказаць, што трэба проста добра рабіць сваю справу і не думаць пра нейкія місіі. Пра тое, які я след пакіну. Мяне гэты след мала хвалюе. Мне важна, што я раблю — тут і зараз.

**Гутарку вёў Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**



Аксана Волкава ў спектаклі «Кармэн» на першым моладзёжным форуме опернага мастацтва краін СНД, Балтыі і Грузіі, май 2012 года.

Фотаздымкі БЕЛТА.

---

■ За падзеяй

# АБАРАНІ АД УСЯГО ЗЛОГА...

## Устаноўлена скульптура Божай Маці «Знаменне» Лагойскай



Скульптар Уладзімір СЛАБОДЧЫКАЎ каля сваёй работы — манумента Божай Маці «Знаменне» Лагойскай.

**Калі ўязджаць у Лагойск з боку сталіцы па Мінскай вуліцы, то ў скверы каля скрыжавання дарог бачыцца велічны помнік — манумент Божай Маці. Яна сустракае і вітае гасцей горада, праводзіць тых, хто ад'язджае, жадае ім добрай дарогі.**

Велічны манумент ілюструе фігуру Божай Маці, якая нібыта спусцілася на зямлю, да людзей. Скульптура стаіць на звычайным прыродным камені. Валун патрэбнага памеру і формы знайшлі ў суседнім Вілейскім раёне. Аўтарам чатырохметровай бронзавай статуі Божай Маці з'яўляецца **знакаміты беларускі скульптар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, загадчык кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзімір СЛАБОДЧЫКАЎ.** Перад ім стаяла складаная задача перанесці вобраз Божай Маці «Знаменне» Лагойскай з іконы ў аб'ёмныя скульптурныя формы. Як адзначыў Уладзімір Іванавіч падчас свайго выступлення на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця скульптуры, незвычайнай рысай кампазіцыі з'яўляецца тое, што на галаве ў Багародзіцы размяшчаецца карона. Гэты элемент рэдка сустракаецца на іконах.

Прылеглая тэрыторыя вакол скульптурнай кампазіцыі ўпарадкаваная: праект добра прадуманы і выкананы. Для рэалізацыі задумкі многа часу і сіл аддала галоўны архітэктар Лагойска Святлана Рыжанкова. Яна расказала:

— Мы доўга шукалі месца для манумента і потым прыйшлі для высновы, што ён павінен стаяць менавіта на пагорку. Божая Маці, па задуме, будзе аберагаць горад і ўсіх яго жыхароў. Пакроў абароны сімвалізуюць раскінутыя ў бакі рукі Багародзіцы.

Пасля малітвы скульптурны вобраз Божай Маці асвяціў епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веніямін і павіншаваў усіх лагайчан з гэтай падзеяй. У прамове ўладыка зазначыў:

— Мы глядзім на выдатны вобраз Божай Маці. Яна з'яўляецца лесвіцай духоўнай, якая злучае неба і зямлю. Рукі яе ўзнятыя, што сімвалізуе малітву. Адзежа мае форму царскага ўбору — гэта значыць, Маці Божая з'яўляецца царыцай неба і зямлі. Жоўтая карона вакол галавы паказвае на нябесную славу Прасвятой Багародзіцы і з'яўляецца знакам святасці.

Старажытная ікона Божай Маці «Знаменне» Лагойскай заўсёды была святыняй Свята-Мікалаеўскай царквы горада. Гэта ікона здаўна лічылася цудатворнай. Людзі прыходзілі да яе са сваімі бедамі, маліліся, прасілі дапамогі — і яна добрым людзям спрыяла. Цікавая гісторыя іконы. Яна, верагодна, з'явілася ў Лагойску ў XVII стагоддзі. З тых часоў перажыла некалькі трагічных момантаў: знікла і лічылася страчанай, была ў прыватнай калекцыі. У 1907 годзе адбыўся шматтысячны хрэсны ход з Мінска ў Лагойск, і абраз урачыста вярнулі ў Свята-Мікалаеўскую царкву. На жаль, за савецкім часам, падчас ганенняў на рэлігію ў 1930-х гадах ікона ізноў знікла. Застаецца спадзявацца, што ў будучыні яна вернецца ў Лагойск. А ў Свята-Мікалаеўскім храме Лагойска цяпер знаходзіцца ўшанаваны спіс цудатворнай іконы Божай Маці.

Няма сумненняў, што і скульптура Божай Маці з цягам часу стане сімвалам Лагойска, яго візітнай карткай, яшчэ адным знакавым месцам, куды будуць прыходзіць людзі і ў цяжкія хвіліны жыцця, і ў святочныя дні.

**Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ**

---

■ Добры пачын

# Новы конкурс стартаваў з рэгіёнаў

## Найлепшыя ўкаранёныя распрацоўкі плануюць пазначаць таблічкамі «Рэалізавана ў рамках «100 ідэй для Беларусі»

**БРСМ даў старт рэгіянальным адборачным турам рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі».**

Да прэзентацыі новых ідэй і распрацовак арганізатары праекта прыступілі ў пачатку кастрычніка. За гэты час у рэгіёнах краіны праведзена больш за 130 выставак з удзелам экспертаў рэспубліканскага ўзроўню. Так званыя занальныя этапы праекта (раённыя, гарадскія) прайшлі ўпершыню, многія з якіх — у фармаце стартап-мерапрыемстваў з запрашэннем мясцовых бізнесменаў і інвестараў. 9 лістапада ў Барысаве адбудзецца Мінская абласная выстаўка-прэзентацыя найлепшых новых маладзёжных ідэй. У экспазіцыю ўвойдуць 28 навукова-тэхнічных распрацовак і інавацыйных праектаў моладзі Міншчыны. У лістападзе—снежні абласныя адборачныя туры конкурсу «100 ідэй для Беларусі» пройдуць ва ўсіх абласцях і Мінску.

Да канца года па ўсёй краіне плануецца адзначыць укаранёныя інавацыйныя распрацоўкі спецыяльнымі таблічкамі з лагатыпам конкурсу «Рэалізавана ў рамках «100 ідэй для Беларусі». З гэтай мэтай у праграму рэгіянальных выставак-прэзентацый уключана наведванне арганізацый і прадпрыемстваў, дзе і прайшлі ўкараненне маладзёжныя распрацоўкі, якія прадстаўлены на конкурс і ўжо ўносяць рэальны ўклад у развіццё беларускай эканомікі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Друкуецца ў «Алесі»

# УРАЎНЕННЕ ЗДАРОЎЯ



**Ад таго, наколькі мы актыўныя і рухавыя, залежыць не толькі наша фігура, але і самаадчуванне, і настрой, і кемлівасць, і многае іншае.**

## СТАІМ = ТРАЦІМ КАЛОРЫІ

Прырода прызначыла чалавека для руху, для мышачнай дзейнасці. Без яе не тое што перамяшчацца — стаяць немагчыма. Стоячы, мы нагружаем мышцы значна мацней, чым седзячы. Ведаеце, чаму? Стаянне — гэта перапыненае падзенне. Цэнтр цяжару фігуры аказваецца наперадзе галёнкаступнёвага сустава. Значыць, калі мы стаім, мы непазбежна падаем наперад, а мышцы вяртаюць нас назад.

Прасядзеўшы 10 хвілін, 60-кілаграмовая дама выдаткуе 14,4 ккал, а прастаяўшы гэтыя ж дзесяць хвілін — ужо 15,6 ккал. Калі ж гэтыя дзесяць хвілін яна правядзе ў гарызантальным становішчы, згарыць усяго 10,2 ккал.

Калі чалавек толькі і робіць, што сядзіць, узнікае гіпакінезія — недастатковасць рухальнай актыўнасці. Пакутуе ад яе, у першую чаргу, мышачная сістэма, яна практычна атрафіруецца. Самы элементарны рух — напрыклад, пад'ём па лесвіцы, калі не працуе ліфт, — падасца непасільным. Вось чаму, нават калі ў вас аўрал і няма калі адысці ад працоўнага стала, важна частку часу правесці хаця б стоячы, а не седзячы.

## СКАЧАМ = УМАЦОЎВАЕМ КОСЦІ

Ад мышачнай бяздзейнасці пакутуюць і косці. Каб мы маглі абапірацца на шкілет, ён павінен быць трывалым. Напрыклад, падчас бегу ўдарныя нагрузкі на касцявую тканку складаюць да 6 мас цела чалавека. І косці вымушаныя паступова ўмацоўвацца.

Калі ж чалавек не рухаецца, арганізму здаецца, што трываласць шкілету не патрэбная. Косць становіцца проста лёгкай — страчвае кальцый. Нават калі вы харчуецеся збалансавана і прымаеце мінеральныя комплексы, ён проста амаль не засвойваецца. Так і да астэапарозу недалёка.

## ХОДЗІМ = ТРЭНІРУЕМ СЭРЦА

Сэрца таксама мышца, і без трэніроўкі яму дрэнна. Хваробы XXI стагоддзя — атэрасклероз і каранарная хвароба сэрца — шмат у чым абумоўленыя нерухомым ладам жыцця.

Першапрычына гэтых захворванняў — адкладанне халестэрыну на сценках артэрый. У нашай крыві ёсць так званая згусальная сістэма, якая ратуе нас ад крывацёкаў. Яна ўключаецца кантактам з чужароднай паверхняй — напрыклад, у адкрытай ране. Халестэрынавую бляшку кроў таксама ўспрымае як чужароднае цела, таму згусае і ўтварае тромб проста ў сасудзе. Гэта шлях да інфаркту, інсульту і іншых небяспек.

Адмова ад халестэрыну ў ежы — не выйсце: без яго арганізм не зможа выпрацоўваць некаторыя гармоны, у тым ліку палавыя.

Але выслізнуць з гэтых нажніц рэальна: трэба проста больш рухацца! Ліфт, які доўга не працуе, — не прыкрая перашкода, а прафілактыка атэрасклерозу. Медыкі ў барацьбе з атэрасклерозам прапісваюць вельмі сур'ёзныя нагрузкі: займацца фітнесам 5-6 разоў на тыдзень па 30-40 хвілін з пульсам не менш як 100 удараў. Можна проста хадзіць, але бадзёрым крокам (1 км за 8-9 хвілін).

## ПРАЦУЕМ РУКАМІ = РАТУЕМСЯ АД ДЫЯБЕТУ

Цукровы дыябет — вельмі распаўсюджанае і каварнае захворванне. Пры дыябеце 1 тыпу ў арганізме няма гармону інсуліну (адказнага за ўтылізацыю глюкозы — паліва для мышцаў). Пры дыябеце 2 тыпу інсулін у крыві ёсць, але рэцэптары клетак яго не ўспрымаюць. У выніку глюкоза не пераходзіць з крыві ў мышачную і тлушчавую тканкі, а пасля ежы кроў літаральна ператвараецца ў ліпкі сіроп.

Дыябет 2 тыпу добра лечыцца мышачнай нагрузкай у спалучэнні з дыетай. Справа ў тым, што ад пастаянных трэніровак адчувальнасць рэцэптараў да інсуліну павышаецца. Акрамя таго, у гэты час клетачныя мембраны становяцца больш пранікальнымі для глюкозы. Таму дыябетык 2 тыпу, які рэгулярна займаецца па пасільнай праграме, можа неўзабаве забыцца на медыкаменты і цалкам вылечыцца.

## ВАРУШЫМ НАГАМІ = СІЛКУЕМ МАЗГІ

У чалавечым мозгу ёсць так званы цэнтр рэтыкулярнай інфармацыі. У яго няма канкрэтнай функцыі — ён падтрымлівае вызначаны ўзровень актыўнасці цэнтральнай нервовай сістэмы ў цэлым. Эксперыменты на жывёлах паказалі: калі рэтыкулярная інфармацыя выключана, жывёла засынае, і яе немагчыма разбудзіць.

Гэта сістэма працуе за кошт нашых адчуванняў і ўражанняў — калі мы бачым, чуем, да чагосьці дакранаемся... Вялікая доля прыпадае на інфармацыю ад рухальнай сістэмы. Пры нерухомым ладзе жыцця цэнтральнай нервовай сістэме хранічна не хапае актывацыі. Вось і атрымліваецца, што мала рухаючыся, мы нават думаць як след не можам.

## БЯЖЫМ = «ВЫХОЎВАЕМ» ГАРМОНЫ

Нерухомасць прыводзіць да агрубення гарманальнай сістэмы. Вобразна кажучы, залозы ўнутранай сакрэцыі трэніруюцца гэтак жа, як мышцы і сэрца, і, вядома, гэта залежыць у першую чаргу ад рэгулярнасці і інтэнсіўнасці нагрузкі.

На першым этапе трэніровак арганізм пачынае выкідваць больш гармонаў, больш актыўна працуюць гіпофіз, наднырачнікі, шчытападобная залоза. Затым паступова гармонаў выпрацоўваецца менш, затое расце адчувальнасць клетак да іх. Па меры росту фітнес-вопыту на адну і тую ж нагрузку арганізм траціць менш сіл, чым раней. Такім чынам, павялічваецца патэнцыял і эканамічнасць эндакрыннай сістэмы. Зрэшты, як вы ўжо зразумелі, гэта адносіцца і да іншых сістэм арганізма.

## ЕМ, КАБ РУХАЦЦА, А НЕ НААДВАРОТ!

Рух і актыўнасць немагчымыя без энергіі, якую мы атрымліваем з ежы. Аднак як правільна дазаваць ежу? Ці можаце вы ўявіць сабе дзікую жывёлу, якая пастаянна аб'ядаецца? Не, такога не бывае! Наадварот, асноўная праблема ў дзікай прыродзе — голад. Тысячагоддзямі ў нас выпрацоўваліся механізмы барацьбы з ім; толькі гадоў сто таму чалавек пачаў есці ўволю і нават пераядаць. Так што змагацца з лішкам калорый наш арганізм пакуль папросту не прывык — ён паранейшаму імкнецца наесціся ў запас.

Выснова простая — уставайце з-за стала з лёгкім пачуццём голаду! Тады не будзе млявасці і санлівасці, не адкладзецца лішні тлушч. І рухайцеся: без гэтага — ніяк!

**Аліна БЯЛОВА**



**Таксама ў лістападаўскім нумары часопіса «Алеся»:**

✓ Як ствараюцца сцэнічныя касцюмы артыстаў Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.

✓ Другая работа, або чым яшчэ займаюцца сучасныя артысты.

✓ Ці можа пост быць смачным? Аб гэтым на кулінарнай старонцы Ларысы Мятлеўскай.

✓ «Геній — у кожным з нас», — сцвярджае Тамара Сахарчук і дзеліцца вопытам, як выхаваць таленавітае дзіця.

■ Спорт-тайм

# РАНА ХВАЛЯВАЦЦА

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра тое, як айчынныя гандбалісты ўпершыню ў гісторыі абыгралі сербаў, як завяршыліся міжнародныя хакейныя турніры ў краіне і за яе межамі, і пра тое, якія клубы ўмацавалі сваё становішча ў першай тройцы чэмпіянату Беларусі па футболе.**

***1. Мужчынская нацыянальная зборная па гандболе на мінулым тыдні стартавала ў адборачным цыкле чэмпіянату Еўропы-2018.*** У першым матчы на сваёй пляцоўцы падапечныя Юрыя Шаўцова ўступілі румынам (23:26), а праз тры дні адправіліся ў Сербію. Выязны паядынак склаўся куды больш удала: са старту і на працягу ўсяго матчу беларусы валодалі ініцыятывай і завяршылі сустрэчу на сваю карысць — 36:27.

Адзначым, што ў трох папярэдніх сустрэчах з сербскімі гандбалістамі зборная Беларусі цярпела паражэнні і зараз упершыню дабілася перамогі.

У другім матчы другога тура зборная Румыніі прымала ў Клужы гандбалістаў Польшчы і, атрымаўшы перамогу 28:23, узначаліла турнірную табліцу. Палякі, якіх перад стартам лічылі галоўнымі фаварытамі гэтага квартэта, пацярпелі другое паражэнне запар. У першым туры яны саступілі сербам у Гданьску з лікам 32:37.

***Турнірнае становішча пасля двух тураў:*** Румынія — 4 ачкі, Беларусь — 2, Сербія — 2, Польшча — 0.

Адборачны турнір кантынентальнага першынства адновіцца ў маі 2017 года, зборная Беларусі прыме на сваёй арэне палякаў, а сербы згуляюць у гасцях у каманды Румыніі.

***2. Юніёрская зборная Беларусі (U-17) заняла трэцяе месца на міжнародным турніры «Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба».*** У заключным матчы турніру гаспадары пляцоўкі ўступілі сапернікам з Расіі 0:3. Адзначым, што расійскія хакеісты шосты раз за дзесяць гадоў праўдзення турніру сталі ўладальнікамі ганаровага трафея. Другое месца ў спаборніцтвах занялі хакеісты Славакіі.

У гэты ж час у Гомелі прайшоў яшчэ адзін міжнародны турнір па хакеі — «Кубак Дружбы» (сярод зборных каманд да 18 гадоў). Беларуская зборная там атрымала перамогу ва ўсіх трох матчах і стала ўладальніцай ганаровага трафея. Другое месца заняла зборная Славакіі, трэцімі сталі немцы.



***3. Тым часам хакеісты нацыянальнай зборнай Беларусі сталі пераможцамі першага тура Еўрачэленджа.*** Падапечныя Дэйва Льюіса нанеслі паражэнні камандам Латвіі (4:0), Францыі (3:0) і Славеніі (4:3).

***4. Вядучая велагоншчыца краіны Таццяна Шаракова двойчы паднялася на п'едэстал на першым этапе Кубка свету па веласпорце на трэку, які завяршыўся ў Глазга.***

У індывідуальнай гонцы праследавання Таццяна стала трэцяй, такое ж месца яна заняла і ў сваёй любімай дысцыпліне — гонцы па ачках. Па выніках чатырох заездаў Шаракова набрала 119 балаў і выйграла другую бронзавую ўзнагароду.

***5. Завяршыўся 28-ы тур чэмпіянату краіны па футболе.*** «Мінск» дома з буйным лікам абыграў «Нафтан» — 4:0, «Віцебск» на сваім полі адолеў «Крумкачоў» — 2:1, жодзінскае «Тарпеда-БелАЗ» на выездзе няўдала згуляла з БАТЭ — 1:2, брэсцкае «Дынама» мінімальна абыграла «Граніт» — 1:0. У нядзелю «Шахцёр» і мінскае «Дынама» атрымалі перамогі і ўмацавалі свае пазіцыі на п'едэстале. Футбалісты з Салігорска былі мацнейшыя за «Іслач» — 3:1, а мінчане перайгралі гродзенскі «Нёман» — 3:2. Матч без галоў прайшоў з удзелам «Белшыны» і «Слуцка» — 0:0. Завяршылі тур «Славія» і «Гарадзея», яны згулялі ўнічыю — 3:3.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

**9 ЛІСТАПАДА**

*Міжнародны дзень барацьбы з фашызмам і антысемітызмам. У ноч з 9 на 10 лістапада 1938 года аднячасова ў Германіі і Аўстрыі пачаліся масавыя яўрэйскія пагромы («Крышталёвая ноч»), арганізаваныя кіраўніцтвам нацысцкай партыі.*

**1512** год — у Падуанскім універсітэце былі скліканы і ўрачыста сабраліся вядомыя дактары святой Калегіі майстроў мастацтваў і медыцыны, каб праэкзаменаваць доктара мастацтваў Францыска, сына Лукі Скарыны з Полацка. Пад старшынствам знакамітага доктара мастацтваў і медыцыны Тадэя Мусаці і пры ўдзеле славутага доктара мастацтваў і медыцыны Францыска Фульманелі з Вероны, а таксама перад усімі прысутнымі дактарамі калегіі ён быў праэкзаменаваны ў строгім парадку і праявіў сябе настолькі слаўна і дастойна, адказваючы на пытанні і прыводзячы доказы, што атрымаў аднадушную хвалу ўсіх прысутных вучоных без выключэння, і было прызнана, што ён валодае дастатковымі ведамі ў галіне медыцыны. Пасля гэтага Францыск Скарына быў абвешчаны доктарам медыцынскіх навук і атрымаў знакі медыцынскага прызнання. Дакумент аб гэтай падзеі (на лацінскай мове) захоўваецца ў архіве Падуанскага ўніверсітэта ў Італіі.



**1818** год — нарадзіўся Іван Сяргеевіч Тургенеў, рускі пісьменнік, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1860). Значную частку жыцця правёў за мяжой. У 1870-х гадах, жывучы ў Парыжы, зблізіўся з дзеячамі народніцкага руху, матэрыяльна дапамагаў у выданні народніцкага часопіса «Вперед». Уваходзіў у гурток найбуйнейшых французскіх пісьменнікаў — Г. Флабера, Э. Заля, А.Дадэ, братоў Ганкур. У 1879 годзе Оксфардскі ўніверсітэт прысвоіў яму ступень доктара звычайнага права. Аўтар цыкла нарысаў «Запіскі паляўнічага», аповесці «Муму», раманаў «Рудзін», «Дваранскае гняздо» і інш.

**1941** год — 75 гадоў таму каля вёскі Малы Трасцянец, што пад Мінскам, нямецка-фашысцкімі захопнікамі створаны Трасцянецкі лагер смерці. Масавыя расстрэлы праводзіліся ва ўрочышчы Благаўшчына (да кастрычніка 1943 года тут загінула 150 тыс. чалавек), затым — ва ўрочышчы Шашкоўка (загінула больш за 50 тысяч), дзе была пабудавана спецыяльная печ-яма для спальвання целаў пакараных. Попел з печы выкарыстоўваўся як угнаенне на палях падсобнай гаспадаркі. Усяго ў Трасцянецкім лагеры смерці загінула 206,5 тыс. чалавек.

**1946** год — 70 гадоў таму нарадзіўся Дзмітрый Дземічаў, беларускі юрыст, доктар юрыдычных навук, прафесар. З 1995 года — загадчык аддзела, намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама. У 1997—1999 гадах — начальнік галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта, з 2001 года — загадчык кафедры Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, з 2006-га — Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Аўтар шэрагу навуковых прац.

Было сказана

**Ніна МАЦЯШ, паэтэса:**
*«Чым больш пакут, тым болей сіл трываць».*

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Апошнія работы перад зімой

**Надвор'е імкліва псуецца, і выходзіць з дома ўжо асабліва і не хочацца... але трэба! На шчасце, работ у лістападзе ў садзе, агародзе і кветніку не так ужо і шмат, а працаёмкіх і маштабных, лічыце, і зусім няма.**



### Што рабіць у садзе

Практычна ўсе садовыя работы ў лістападзе звязаны з барацьбой са шкоднікамі і падрыхтоўкай да зімы, а таксама будучай вясны (якая таксама можа быць суровай да дрэў).

Вычарпальны спіс садовых работ у лістападзе выглядае так:

- прафілактычная апрацоўка ад хвароб і шкоднікаў растворам меднага купарвасу;
- санітарнае абразанне дрэў і кустоў;
- сховішча раслін у прыкопе;
- выдаленне падпорак з-пад галінак пладовых дрэў;
- ачыстка штамбаў дарослых дрэў ад старой кары, лішайнікаў;
- абарона іглічных раслін абвязваннем кроны тканым матэрыялам;
- пабелка штамбаў і пачатку шкілетных галін;
- абарона ад грызуноў і абвязка штамбаў дрэў;
- уборка саду ад смецця, лісця і раслінных адходаў;
- нарыхтоўка чаранкоў для зімовых прышчэпак;
- абразанне ліян у пачатку лістапада — актынідыі, лімонніка, вінаграду;
- абразанне каранёвых парасткаў у бэзу, бружмелі, вішні, слівы, алычы, глогу, абляпіхі;
- нарыхтоўка насення дэкаратыўных дрэў і кустоў для падзімовага і вясновага пасеву;
- устаноўка кармушак для птушак.

Усе ведаюць, як абвязкай абараняюць дрэвы ад грызуноў. Ёсць і іншы спосаб — раслінныя рэшткі пасля ўборкі можна ўторкнуць вакол высадка, стварыўшы частакол. Для гэтай мэты падыходзяць засохлыя сцёблы флёксу мяцельчатага, салідага, грэчкі сахалінскай, абрэзаныя сухія галінкі маліны. Не забудзьцеся абвязаць іх вакол ствала вяроўкай.

Асобнай увагі заслугоўвае і абарона дрэў ад апёкаў і маразабоін — пабелкай на аснове гліны ці адмысловай акрылавай фарбай для садовых дрэў. Вышыня — да 1,7 метра. І калі за зіму абарона «аблезе», не палянуйцеся паўтарыць яе ў канцы лютага або пачатку сакавіка.

Туі і ядлоўцы таксама маюць патрэбу ў адмысловым доглядзе. Каб галіны не сагнуліся назаўжды пад цяжарам снегу, іх трэба абвязаць шпагатам. Крону таксама варта абараніць ад сонечных апёкаў, абгарнуўшы галіны мешкавінай (вялікія дрэвы можна толькі з паўднёвага боку).

### Што рабіць у агародзе

Збіраць у агародзе ўжо нічога не трэба — час сяўбы пад зіму і прыбірання. Дарэчы, саджаць не позна нават пасля выпадзення першага снегу.

Вычарпальны спіс агародных работ у лістападзе выглядае так:

- набыццё насення для пасеваў пад зіму морквы, буракоў, зеляніны;
- пасеў і пасадка часнаку, цыбулі шалоту, цыбулі сеянкі, морквы, зеляніны, буракоў;
- мульчыраванне градак з пасевамі пад зіму (пры надыходзе замаразкаў);
- нарыхтоўка торфу, агароднай зямлі, кампосту, перагною;
- размяшчэнне гародніны і зеляніны на выганку (цыбуля, пятрушка, сельдэрэй, буракі);
- уборка ў цяпліцы;
- перакопка глебы, уборка раслінных рэшткаў;
- барацьба з грызунамі: раскладванне атрутных прынад у садзе і сховішчах;
- квашанне капусты, мачэнне яблыкаў.

Што б вы ні саджалі ў лістападзе, памятайце — усё давядзецца мульчыраваць, напрыклад, пілавіннем, а лепш нават торфам. Паліваць пасадкі пад зіму не трэба. Калі зіма будзе маласнежнай — падкідвайце снег на градкі. Дарэчы, нават першы снег пасадкам пад зіму не перашкода, яго можна проста змесці ўбок і спакойна пасадзіць тое, што хацелася.

Лістапад — самы час для нарыхтоўкі розных відаў грунту пад стварэнне глебавых сумесяў вясной. У крамах не заўсёды ёсць патрэбнае, так што лепш папрацаваць цяпер. Прасцей за ўсё ссыпаць патрэбную зямлю ў шчыльныя поліэтыленавыя пакеты і падпісаць іх: «пясок рачны», «торф верхавы», «дзярновая зямля», «перагной», «пілавінне». Захоўваць можна дзе заўгодна, хоць у хляве, хоць дома на балконе — прамарожванне пойдзе толькі на карысць.

### Што рабіць у кветніку

Лістападаўскія клопаты ўключаюць сховішча на зіму ўсяго, што яшчэ не схавана, а ў прамежках — збор лекавых траў і пасеў раслін на выганку.

Вычарпальны спіс работ у кветніку ў лістападзе выглядае так:

- кляматысы: канчатковае сховішча на зіму;
- ружы: укрыццё нятканымі матэрыяламі, устаноўка паветрана-сухой хованкі;
- буйналісцевыя гартэнзіі, дрэвападобныя півоні: канчатковае сховішча на зіму;
- Закладка на зімовае захоўванне караняклубняў вяргіні, кан;
- мульчыраванне ўсходніх лілей і ўстаноўка хованак ад вільгаці;
- абразанне шматгадовых раслін, навядзенне парадку ў кветніках;
- пасеў пад зіму аднагадовых і шматгадовых кветак;
- пасадка цюльпанаў і гіяцынтаў (калі не прамерзла глеба);
- пасадка раслін на выганку (цюльпаны, крокусы, ландышы, гіяцынты);
- збор лекавых раслін: алтэй (карані), жывакост (карані), остальнік палявы (карані), вольха шэрая (суплоддзі).

Больш за ўсё клопату, мабыць, з раслінамі ў кантэйнерах: зямля ў іх звычайна цалкам прамярзае, так што раслінам будзе вельмі дрэнна. Каб гэтага не адбылося, выкапайце вялікія ямы і пастаўце кантэйнеры ў іх так, каб расліны атрымалася прыкапаць «па шыю». Паверхню глебы замульчыруйце, адступіўшы ад каранёвай шыйкі, прыкапайце расліны, атуліце лапнікам.

Ёсць хітры спосаб захоўвання раслін са «спячымі» пупышкамі проста ў садзе. Саджанцы руж з адкрытай каранёвай сістэмай і расаду шматгадовых кветак многія пачынаюць купляць ужо ў лютым, і, каб можна было захаваць іх у садзе, давядзецца падрыхтавацца да таго, як прамерзне глеба. Знайдзіце добрае, даступнае месца. Вырыйце яму глыбінёй 70—90 см і ўстаўце туды фанерны кораб з накрыўкай, прыбіце на яе ручку. Накрыйце зверху цыратай і прысыпце вынятай з ямы зямлёй. Калі прыйдзе час, расчысціце месца, зніміце цырату, падніміце накрыўку і змясціце пакет з саджанцамі ў кораб, а потым зноў усё накрыйце. Снег не дазволіць раслінам прамерзнуць, а цырата захавае аптымальную вільготнасць.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.26 | 17.20 | 8.54 |
| Віцебск — | 8.20 | 17.05 | 8.45 |
| Магілёў — | 8.16 | 17.10 | 8.54 |
| Гомель — | 8.07 | 17.12 | 9.05 |
| Гродна — | 8.40 | 17.36 | 8.56 |
| Брэст — | 8.35 | 17.42 | 9.07 |

**Месяц**

***Першая квадра 07.11—13.11. Месяц у сузор'і Вадалея.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Апанаса, Дзмітрыя.*
***К.*** *Клаўдзіі, Адрыяна, Віктара.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Першае правіла сельскага клуба: каму не хапіла месца стаць ля сцяны — той танчыць.**

— А ў Пецярбургу даўно дождж?
— З 1703 года...

**Дапамог жонцы ва ўборцы кватэры. Ачысціў халадзільнік ад піва.**

— Ты калі апошні раз жонцы кветкі дарыў? Не на 8 Сакавіка, не на дзень нараджэння, а проста так?
— Ага, падары ёй, паспрабуй. Адразу пачнуцца падазрэнні, капаць пачне. І абавязкова нешта адшукае.

**Будзеш мяне крыўдзіць, выйду за цябе замуж, нараджаю 10 дзяцей, а яны народзяць 30 унукаў, а тыя — 90 праўнукаў, а карміць усіх павінен будзеш ты!**




Малюнак Уладзіміра ЧУГЛАЗАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4503.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 8 лістапада 2016 года.